НАША ПАМЯЦЬ

# З сельсавецкай пячаткай і сцягам прайшоў праз ліхалецце

**Карнікі амаль з першых дзён вайны лютавалі на любанскай зямлі. Але і мясцовае насельніцтва не схіліла сваёй галавы перад нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Сярод тых, хто смела супрацьстаяў варожым сілам, быў і Сцяпан Карнееў. Пра яго наш сённяшні аповед.**

Сцяпан Тамашавіч нарадзіўся 27 чэрвеня 1912 года ў вёсцы Жывунь у шматдзетнай сялянскай сям'і. Калі яму споўнілася восем гадоў, памерла маці. Бацька сам займаўся выхаваннем дзяцей. «Жылі бедна, сваёй зямлі не было. Толькі ў 1929 годзе атрымалі ўчастак у 1,5 дзесяціны», – прыгадваў пасля Сцяпан.

Але нягледзячы на няпростае дзяцінства, тым не менш ён змог закончыць мясцовую школу. Быў актывістам. І ў 1928-м яго прынялі ў камсамол, а неўзабаве накіравалі на курсы ў Мар'іну Горку. Літаральна перад ліхалеццем за арганізатарскія якасці, руплівасць Сцяпан Карнееў быў абраны старшынёй Загальскага сельскага савета.

У той дзень, 22 чэрвеня сорак першага, ён падняўся на ранішняй зорцы і паспяшаўся ва ўрочышча, дзе вадзіліся ваўкі. Трэба было паспець, пакуль не спала раса і не зніклі сляды драпежнікаў, якія нападалі на статкі кароў і прыносілі шмат пакут сялянам. Вяртаўся апоўдні без настрою: звяроў не знайшоў. І раптам у небе пачуўся бесперапынны гул – пранёсся самалёт з чорнымі крыжамі на крылах. Сцяпан збянтэжыўся ад нечаканасці, але хутка апрытомнеў і пабег у вёску. Там ужо на вуліцы сабраліся людзі. Яны кінуліся насустрач старшыні з воклічам: «Бяда, фашысты напалі на нас!»

Пасля размовы па тэлефоне з першым сакратаром Любанскага райкама партыі Іванам Гуліцкім і старшынёй райвыканкама Андрэем Луферавым Сцяпану стала ясна, што трэба рабіць. Карнееў, які не змог ісці ў армію па стане здароўя, атрымаў заданне застацца ў родных мясцінах і ўзнімаць народ на адпор ворагу. На наступны ж дзень па яго прапанове надзвычайная сесія Савета абмеркавала пытанні арганізацыі самаабароны, мабілізацыі ваеннаабавязаных, эвакуацыі грамадскай жывёлы і захавання сельгастэхнікі, работы сельсавета ў ваенных умовах...

Калі немцы акупіравалі раён, Сцяпан Карнееў разам з жонкай далучыліся да партызан. Спачатку ён быў радавым воінам, а потым узначаліў партызанскі атрад у вёсцы Баянічы. Наш зямляк вылучаўся адвагай у баявых апрацыях: пры разгроме нямецкіх і паліцэйскіх гарнізонаў, у разведцы, у вядомай рэйкавай вайне. А лясныя мсціўцы яго атрада «Баяніцкі» здзяйснялі рэйды ў тыл ворага. Дапамагалі Чырвонай Арміі грамiць гітлераўцаў, ахоўваць і абараняць на акупіраванай тэрыторыі мірнае насельніцтва ад фашыстаў, зберагаць народнае дабро, разам з іншымі партызанамі ўдзельнічалі ў стварэнні аэрадрома на востраве Зыславе. Вялікую ўвагу ўдзялялі таксама агітацыі, выпускалі і распаўсюджвалі лістоўкі.

**По ўспамінах У. Плешавені, які ваяваў супраць акупантаў у адной брыгадзе з Карнеевым, у радах партызан Сцяпан Тамашавіч займаў асаблівае месца. Да таго ж усю вайну ён не здымаў з сябе абавязкаў паўнамоцнага прадстаўніка савецкай улады, заставаўся старшынёю сельскага савета да лета сорак чацвёртага, калі Беларусь была вызвалена ад нямецкіх акупантаў.**

Яшчэ на пачатку ліхалецця, схаваўшы ў лесе ўсю важную дакументацыю, Карнееў узяў з сабою пячатку і сцяг. Пячаткай ён завяраў даведкі тым, хто выконваў адказныя заданні, а перад сцягам партызаны прымалі прысягу.

Ратнае жыццё для Сцяпана Тамашавіча закончылася ў ліпені 1944 года. А баявы шлях яго за праяўленыя адвагу, самаадданасць і мужнасць быў адзначаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, медалямі Жукава, «За адвагу», «За доблесную працу ў гады Вялікай Айчыннай вайны», «Партызану Айчыннай вайны», «За перамогу над Германіяй» і іншымі.

Пасля вызвалення Беларусі ад карычневай чумы Карнееў вярнуўся ў сваё Загалле з тымі ж сельсавецкай пячаткай і сцягам, якія збярог у ліхалецце. Ён не ўяўляў для сябе іншага жыцця. І адразу ж заўзята ўзяўся за справу, бо патрэбна было ўзнаўляць усё знішчанае ворагам. Не дзіўна, што ўжо ў першыя пасляваенныя выбары ў сельскі Савет вяскоўцы зноў аднагалосна абралі Сцяпана Тамашавіча кіраўніком. Яму верылі, за ім ішлі, бо высокую пашану і павагу заслужыў сваімі ратнымі подзвігамі, якія былі здзейснены ў імя свабоды і незалежнасці Радзімы.

Дзякуючы стараннням і руплівасці старшыні, яго ўменню арганізаваць работу жыццё сельсавета паступова абудзілася, вярнулася ў мірнае ствальнае русла. На месцы папялішчаў з'явіліся новыя дыхтоўныя дамы, вытворчыя пабудовы, сацыяльныя аб'екты. І ўжо ў 1950-м быў дасягнуты даваенны ўзровень развіцця.



**Да апошніх дзён Сцяпан КАРНЕЕЎ быў адданы Айчыне.**



**З баявымі таварышамі на легендарным востраве Зыславе.**

**Рыгор ЛЯЎЧЭНЯ,
настаўнік гісторыі і грамадазнаўства Соснаўскай СШ №2.
Фота з архіва Любанскага музея народнай славы.**

## Конкурс на лепшы лагатып

**Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь запрашае ўсіх, хто жадае, далучыцца да стварэння яркага, гістарычна значнага сімвала, прысвечанага 80-годдзю Вялікай Перамогі.**

Конкурс праходзіць у анлайн-фармаце і закліканы вызначыць своеасаблівую выяву, якая адлюстроўвае канцэпцыю святкавання такой значнай гадавіны. Згодна з Палажэннем творчая работа павінна ўяўляць сабой стылізаваны графічны вобраз, распрацаваны з выкарыстаннем сучасных графічных рэдактараў, і суправаджацца тлумачальнай запіскай, якая раскрывае яго задумку. Прычым абавязкова адпавядаць заканадаўству нашай краіны.

Варта дадаць, прыняць удзел у такім спаборніцтве можа як асобны аўтар, так і калектыў. Вынік свайго плёну неабходна адправіць па электроннай пошце з паметкай «Конкурс на лепшы лагатып (сімвал)» на адрас uprofart@gmail.com. А больш падрабязна з умовамі конкурсу і патрабаваннямі да афармлення работ можна азнаёміцца на афіцыйным сайце Міністэрства культуры.

Адкрыты конкурс на лепшы лагатып – гэта не толькі выдатная магчымасць праявіць свае творчыя здольнасці, але аддаць даніну павагі пакаленню вызваліцеляў, іх гераізму, мужнасці, адданасці Айчыне, а таксама ўнесці ўклад у захаванне памяці аб неўміручым подзвігу нашага народа.